№1Сентябрь 2024г.

# Рабочая смена

Общественно-информационное издание ГПТК электротехники г.Белоозерска

## 2 Верасня – Дзень ведаў!

Традыцыйна свята ведаў прысвячаецца пачатку новага навучальнага года. Для яго правядення загадзя складаецца сцэнар, запрашаюцца ганаровыя госці, рыхтуюцца граматы і падзячныя лісты…

І вось панядзелак, 9.00 раніцы – Белаазёрскі ДПТКэ. Стройныя шэрагі навучэнцаў замерлі ў чаканні самых лепшых пажаданняў у дасягненні поспехаў.



У пачатку свята з прывітальным словам выступіў дырэктар каледжа А.У. Шымчук, пасля чаго па выніках мінулага навучальнага года ўручыў граматы навучэнцам за добрую вучобу, а таксама актыўны ўдзел у грамадскім жыцці каледжа. Па традыцыі каледжа старшакурснікі перадалі «Ключ ведаў» у рукі першакурснікаў які будзе служыць ім як заклад поспеху.

Натхнёныя дзяўчаты і хлопцы адправіліся на свой першы ўрок 2024-2025 навучальнага года.

Другая частка свята для іх праводзілася на тэму "Нам ёсць чым ганарыцца, нам ёсць што берагчы!". У Год якасці і 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў размова ішла аб дасягненнях беларускага народа, якімі мы па праве ганарымся, аб тых каштоўнасцях, якія важна захаваць у імя будучыні.




## Экспедыцыя «Дарога да святыняў»

***Наш каледж 30 жніўня сустракаў удзельнікаў 31 Рэспубліканскай навукова-асветніцкай экспедыцыі "Дарога да святыняў", прымеркаванай да Дня беларускага пісьменства.***



У апошні дзень лета, 31 жніўня, ў Белаазёрскім палацы культуры адбылася сустрэча з арганізатарамі і ўдзельнікамі гэтай экспедыцыі. У сустрэчы бралі ўдзел праваслаўныя святары, прадстаўнікі арганізацый горада, сярод якіх і педагогі нашага Белаазёрскага каледжа электратэхнікі.



Пратаіерэй Аляксандр Пачопка, настаяцель храма Свяціцеля Мікалая Цудатворцы расказаў пра Жыватворны агонь і цудатворную «Загор'е-Сталавіцкую» ікону Пакрова Прасвятой Багародзіцы, якія экспедыцыя возіць па гарадах і вёсках Беларусі. Падчас экспедыцыі праводзіцца вялікі хрэсны ход, царкоўная служба, удзельнікі экспедыцыі:пісьменнікі, паэты, музыкі, навукоўцы праводзяць сустрэчы, каб людзі «не забывалі культурную і духоўную спадчыну».

Кіраўнік экспедыцыі, навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Аляксандр Лапата-Загорскі, галоўны захавальнік цудатворнай «Загор'е-Сталавіцкай» іконы Пакрова Прасвятой Багародзіцы, падкрэсліў, што галоўная задача экспедыцыі — данесці да гарадоў і вёсак краіны атмасферу свята пісьменства, наблізіць дзеячаў культуры да людзей. Таксама ён згадаў, што цудатворная Загор'е-Сталовіцкая ікона Прасвятой Багародзіцы, была здабытая ў 1983 годзе — яна трапіла ў коўш экскаватара пры будаўніцтве дарогі Брэст-Масква.

(канчатак на стар.2)

# Экспедыцыя «Дарога да святыняў»

(канчатак, пачатак на стар.1)

Калі звернімся да гісторыі, дык нагадаем, што навукова-асветніцкая экспедыцыя “Дарога да святыняў” пачала свой адлік з 1994 года і праводзіцца адначасова з Днём пісьменства.У ёй бярэ ўдзел творчая і навуковая інтэлігенцыя краіны: пісьменнікі, мастакі, музыканты, навукоўцы. Традыцыйна экспедыцыя пачынаецца ў Мінску, у Свята-Духавым кафедральным саборы, дзе захоўваецца Благадатны агонь ад Гроба Гасподняга, а далейшы маршрут вызначаецца ў залежнасці ад сталіцы Дня пісьменства.

Сімвалічна, што менавіта 28 жніўня, у свята Успення Прасвятой Багародзіцы, з Мінскага Свята-Духава кафедральнага сабора пасля набажэнства і малебена стартавала 31-я экспедыцыя «Дарога да святыняў.

Госці спяшаліся наведаць г.Белаазёрск, каб адтуль патрапіць у горад Івацэвічы. Там адбылася перадача Благадатнага агню на лампадкі і свечкі прыхаджан.

Нагадаем, экспедыцыя ўжо больш за тры дзесяцігоддзі з'яўляецца неад'емнай часткай штогадовых святочных мерапрыемстваў, прысвечаных Дню беларускага пісьменства. Гэтым разам маршрут пралягаў па тэрыторыі Мінскай і Брэсцкай абласцей, праходзячы праз Мінскую, Пінскую і Лунінецкую епархіі. Удзельнікі экспедыцыі прыпыняліся ў Баранавіцкім раёне, Ляхавічах, Пінску, Іванава, Драгічыне і Белаазёрску. Завяршыўся маршрут ў Івацэвічах. Усяго пройдзена больш за 750 кіламетраў.

Свае вершы, у тым ліку і натхнёныя падарожжамі «Дарогі да святыняў», прачыталі паэты Бранiслаў Спрынчан, Генадзь Пашкоў, Янка Лайкоў. У паветры вялікай залы гучалі радкі Яўгеніі Янішчыц і Генадзя Бураўкіна. Моладзевы гурт “Вір” з Барысава прапанаваў белаазёрцам сярэднявяковую музыку, песні на беларускай, польскай і ангельскай мовах.

Аляксандар Лабада, удзельнік экспедыцыі 1997 году, успомніў мерапрыемствы, якія праводзіліся тады ў Белаазёрску, прэзентаваў кнігі для мясцовай бібліятэкі аб дзейнасці ***Рэспубліканскай навукова-асветніцкай экспедыцыі «Дарога да святыняў».***



Арганізатары экспедыцыі рупліва ахоўваюць традыцыі. На маршруце экспедыцыі асвячаюцца помнікі славы і мужнасці нашага народа, каля магільных пахаванняў загінуўшых воінаў і партызан папярэдніх войнаў служацца памінальныя ліціі. Паўсюль у супольны Сад Малітвы Беларусі пад дрэвы падсыпаецца асвечаная зямля з усіх мясцін папярэдніх маршрутаў Экспедыцыі і сёлетняга,трыццаць першага.

Экспедыцыя — адна з галоўных падзей Дня беларускага пісьменства, якая з'яўляецца пралогам да сврткаванняў *роднага слова.*

*Жанна Кулак*

# МОЁ ХОББИ - РИСОВАНИЕ

(окончание., начало в № 8)



*Повзрослев, какие темы больше прилекают?*

В школе я рисовал на разные выставки в конце 9 класса. Получил грамоту за рисование. В колледже я рисовал проект «Город будущего». Его забрали на выставку и уже не вернут. Это печально, ведь рисунок на память я не получу.

*Когда удаётся находить время на своё увлечение?*

Из всех 24 часов суток предпочтение отдаю ночному времени, когда все легли спать, под кружку чая и настольную лампу,когда на улице тихо и малолюдно.

*Какова участь Ваших рисунков?*

С 7 лет я начал откладывать и складывать рисунки с персонажами в свою коробку. Их там уже около 600.

В детстве я рисовал не на качество, а на количество: я спокойно мог за один раз нарисовать 200 воинов, чтобы 100 было за одного короля и сто – за другого. Теперь не могу и 40 за неделю, но вырисовывается каждый.

Свои рисунки я никому не дарю не потому, что жадный, а потому, что считаю их недостаточно совершенными. Но иногда, изредка, когда рисунки нравятся друзьям, я просто отдаю их им.

Не дарю, поскольку люблю смотреть на них через некоторое время. И проверять, насколько лучше я стал рисовать. Например, свою любимую коллекцию фэнтези. Каждого персонажа рисовал долго, и поэтому она сейчас выглядит очень хорошо. При этом рисовал карты, биографии каждого героя, писал даже заметки и придумывал их предыстории и диалоги. Будто бы они живые. Я вложил в этот проект половину года.

*Почему не посещал изостудию?*

Рисование для меня как хобби, не вижу смысла его развивать. Сейчас есть возможность учиться самому. В интернете технику подсматриваю.

По окончании колледжа скорее всего ничего не изменится в этом плане. Изредка для души буду рисовать в свободное время. Своим детям буду помогать развивать это умение, если у них будет желание. Есть вероятность, что «позовёт» таки меня архитектура. Тогда придётся развивать свои навыки, чтобы сдать экзамен по рисунку.

*Что говорят о твоём увлечении родные, друзья?*

Мне удалось спросить своего друга Никиту о его отношении к моим рисункам. Его ответ: ну прикольно, мне нравится.

Было бы интересно поучаствовать в тематических выставках, конкурсах рисунков.



*Один из любимых рисунков “Демон из японского аниме”.*

*Роман Кукета,*
*Жанна Кулак*

**Издатель: Белоозерский ГКэ**
**Адрес редакции:** 225215 г.Белоозерск,
Брестской обл. ул.Энергетиков, 8; тел/факс 29838,
**-mail:** ptu82@brest.by
**Редактор: Жанна Кулак**
**Редколлегия:** кружок «Юнкор»
**тираж:** 10
**При перепечатке материала ссылка на газету обязательна**